Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»

# Вестник БарГУ

**Ежеквартальный научно-практический журнал**

Издаётся с марта 2013 г. Выпуск 5, декабрь, 2017. Серия «Исторические науки и археология. Экономические науки. Юридические науки»

*Учредитель:* учреждение образования «Барановичский государственный университет».

**РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ**

*Главный редактор журнала* Кочурко Василий Иванович, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, академик Белорусской инженерной академии, академик Международной академии технического образования, академик Международной академии наук педагогического образования, академик Академии экономических наук Украины, Заслуженный работник образования Республики Беларусь, ректор учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

*Заместитель главного редактора журнала* Климук Владимир Владимирович, кандидат экономических наук, доцент, проректор по научной работе учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

**РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ СЕРИИ**

**Главный редактор серии**

Познякевич Виктория Николаевна, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой бухгалтерского учёта, анализа, аудита и статистики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

**Ответственный секретарь серии**

Познякевич Виктория Николаевна, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой бухгалтерского учёта, анализа, аудита и статистики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

**Редактор текстов на английском языке**

Пинюта Ирина Вячеславовна, кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры профессиональной иноязычной подготовки учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Андрияшко Марина Васильевна *(ответственный за направление «Юридические науки»)*, кандидат юридических наук, доцент, заведующий кафедрой общеправовых дисциплин и государственного управления учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Демидович Анатолий Викторович *(ответственный за направление «Исторические науки и археология»)*, кандидат исторических наук, заведующий кафедрой социально-гуманитарных дисциплин учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Короб Александр Николаевич *(ответственный за направление «Экономические науки»)*, кандидат экономических наук, заведующий кафедрой теоретической и прикладной экономики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Безуглая Виктория Александровна, кандидат экономических наук, доцент, декан факультета экономики и права учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Василевич Григорий Алексеевич, Заслуженный юрист Республики Беларусь, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой конституционного права Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Вишневский Алексей Фёдорович, доктор исторических наук, профессор кафедры теории и истории государства и права учреждения образования «Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь» (Минск, Республика Беларусь).

Гурский Василий Леонидович, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой экономики частного учреждения образования «БИП — Институт правоведения» (Минск, Республика Беларусь).

Демичев Дмитрий Михайлович, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой теории и истории права учреждения образования «Белорусский государственный экономический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Житкевич Галина Яковлевна, кандидат экономических наук, доцент, доцент кафедры бухгалтерского учёта, анализа, аудита и статистики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Репозиторий БарГУ

Захарченко Людмила Анатольевна, кандидат экономических наук, доцент, доцент кафедры экономической теории учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Зорин Роман Георгиевич, кандидат юридических наук, доцент, заведующий кафедрой гражданских и уголовно-правовых дисциплин учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Карев Дмитрий Владимирович, доктор исторических наук, профессор, профессор кафедры дизайна, директор Центра социально-экономических и междисциплинарных исследований диаспор и зарубежного белорусоведения учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» (Гродно, Республика Беларусь).

Касич Алла Александровна, доктор экономических наук, профессор Кременчугского национального университета имени М. Остроградского (Кременчуг, Украина).

Ключко Римма Николаевна, кандидат юридических наук, доцент, заведующий кафедрой уголовного права, уголовного процесса и криминалистики учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» (Гродно, Республика Беларусь).

Козлова Зоя Николаевна, кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры теории и практики физической культуры учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Колядко Иван Николаевич, кандидат юридических наук, профессор, профессор кафедры гражданского процесса и трудового права Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Куган Светлана Фёдоровна, кандидат экономических наук, доцент, заместитель декана экономического факультета учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Кузьменко Владимир Иванович, доктор исторических наук, профессор, заведующий Центром истории постиндустриального общества Государственного научного учреждения «Институт истории Национальной академии наук Беларуси» (Минск, Республика Беларусь).

Литвинский Александр Владимирович, кандидат исторических наук, доцент кафедры социально-гуманитарных дисциплин учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Лосев Владимир Владимирович, кандидат юридических наук, доцент, заместитель директора Государственного учреждения «Научно-практический центр проблем укрепления законности и правопорядка Генеральной прокуратуры Республики Беларусь» (Минск, Республика Беларусь).

Лютый Анатолий Михайлович, доктор исторических наук, профессор, профессор кафедры истории Беларуси и славянских народов учреждения образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка» (Минск, Республика Беларусь).

Манкевич Ирина Петровна, кандидат юридических наук, доцент, доцент кафедры гражданско-правовых дисциплин учреждения образования «Белорусский государственный экономический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Матвеюк Ярослав Николаевич, кандидат юридических наук, уполномоченный ректора Университета в Белостоке по делам сотрудничества с университетами Восточной Европы (Белосток, Польша).

Медведева Гульнара Борангалиевна, кандидат экономических наук, доцент, доцент кафедры экономической теории учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Момот Татьяна Валерьевна, доктор экономических наук, профессор Харьковской национальной академии городского хозяйства (Харьков, Украина).

Нечухрин Александр Николаевич, доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой всеобщей и славянской истории учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» (Гродно, Республика Беларусь).

Омельянюк Александр Михайлович, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой экономической теории учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Острогляд Александр Васильевич, кандидат юридических наук, доцент, проректор по научной работе частного высшего учебного заведения «Ивано-Франковский университет права имени Короля Даниила Галицкого» (Ивано-Франковск, Украина).

Солодовников Сергей Юрьевич, доктор экономических наук, доцент, заведующий кафедрой экономики и права Белорусского национального технического университета (Минск, Республика Беларусь).

Сулайманова Назгуль Назарбековна, доктор юридических наук, доцент, заведующий кафедрой уголовного права и криминологии Государственного образовательного учреждения высшего профессионального образования «Кыргызско-Российский Славянский университет» (Бишкек, Кыргызская Республика).

Таранова Татьяна Сергеевна, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой гражданско-правовых дисциплин учреждения образования «Белорусский государственный экономический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Функ Ян Иосифович, доктор юридических наук, профессор, профессор кафедры финансового права и правового регулирования хозяйственной деятельности Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Черняк Юрий Вячеславович, кандидат исторических наук, доцент кафедры общеправовых дисциплин и государственного управления учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Шалаев Владимир Павлович, доктор философских наук, профессор, декан факультета социальных технологий Федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего профессионального образования «Поволжский государственный технологический университет» (Йошкар-Ола, Республика Марий Эл, Российская Федерация).

Шабанов Вячеслав Борисович, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой криминалистики Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Шевлюков Александр Петрович, доктор экономических наук, профессор, заведующий кафедрой бухгалтерского учёта и финансового менеджмента в отраслях народного хозяйства учреждения образования «Белорусский торгово-экономический университет потребительской кооперации» (Гомель, Республика Беларусь).

Юркевич Николай Григорьевич, доктор юридических наук, профессор, профессор кафедры гражданского процесса и трудового права Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Яковчик Николай Степанович, доктор экономических наук, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, директор Института повышения квалификации и переподготовки кадров АПК учреждения образования «Белорусский государственный аграрный технический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Репозиторий БарГУ

*Адрес редакции:*
ул. Войкова, 21, 225404 г. Барановичи.
Телефон: +375 (163) 45 46 28.
E-mail: vestnik@barsu.by .

*Подписные индексы:* 00993 — для индивидуальных подписчиков; 009932 — для организаций.

Свидетельство о регистрации средств массовой информации № 1533 от 30.07.2012, выданное Министерством информации Республики Беларусь.

*В соответствии с приказом Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 21 января 2015 г. № 16 научно-практический журнал «Вестник БарГУ» серия «Исторические науки и археология. Экономические науки. Юридические науки» включён в Перечень научных изданий Республики Беларусь для опубликования результатов диссертационных исследований по историческим наукам и археологии, экономическим и юридическим наукам.*
*Научно-практический журнал «Вестник БарГУ» включён в РИНЦ (Российский индекс научного цитирования), лицензионный договор № 06-1/2016.*

*Издатель:* учреждение образования «Барановичский государственный университет».

Выходит на русском, белорусском и английском языках.

Журнал распространяется на территории Республики Беларусь.

---

*Заведующий редакционно-издательской группой* С. А. Березнюк
*Технический редактор* А. Ю. Сидоренко
*Компьютерная вёрстка* С. А. Березнюк
*Корректор* С. А. Березнюк

Подписано в печать 14.12.2017. Формат 60 × 84 $^{1}/_{8}$. Бумага офсетная. Печать цифровая. Гарнитура Таймс. Усл. печ. л. 23,00. Уч.-изд. л. 19,20. Тираж 75 экз. Заказ .
Цена свободная.
Полиграфическое исполнение: Гродненское областное унитарное полиграфическое предприятие «Слонимская типография». Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий № 1/203 от 07.03.2014, № 2 от 25.02.2014.
Адрес: ул. Хлюпина, 16, 231800 Слоним, Гродненская обл.

© БарГУ, 2017

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ

### ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Ганский В. А., Калачёва И. И.** Туристические маршруты в Западной Беларуси (1921—1939 годы) . . . . . . . . . . . . . . . . 13

**Жилинский П. А.** Характерные черты и сущность социально-экономического кризиса в Беларуси в начале 1990-х годов . . . . . . . . . . . . . . . . 19

**Корнелюк В. Г.** События вынужденной миграции населения Беларуси, вызванные Первой мировой войной, на страницах книг серии «Память» . . . . . . . . . . . . . . . . 27

**Кручковский Т. Т.** История России первого периода и польско-русские отношения этого периода в интерпретации В. О. Ключевского . . . . . . . . . . . . . . . . 33

**Пискун В. Э.** Политика Польши в отношении ФРГ во второй половине 1980-х годов . . . . . . . . . . . . . . . . 41

**Чуль Р. В.** Политика российского правительства в отношении православной конфессии на территории Беларуси в конце XVIII — начале XX века . . . . . . . . . . . . . . . . 46

**Ярмусик Э. С.** Католический Костёл и проблемы семьи . . . . . . . . . . . . . . . . 51


### ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Биглова Г. Ф., Житкевич Г. Я., Познякевич В. Н.** Феномен волонтерства как социальная инновация и его экономический эффект . . . . . . . . . . . . . . . . 60

**Власюк Ю. А., Ковалевич О. А.** Оценка эффективности туризма в регионе . . . . . . . . . . . . . . . . 65

**Климук В. В.** Наноиндустриальный сектор экономики: инфраструктура, состояние рынка . . . . . . . . . . . . . . . . 70

**Кочурко О. А., Янукович О. В., Диковицкая Д. В.** Перспективы кластеризации региональной экономики . . . . . . . . . . 77

**Кременевская В. Н.** Кластерный подход к устойчивому развитию туристических дестинаций. Перспективы развития туристического кластера «Зеленое кольцо Барановичей» . . . . . . . . . . . . . . . . 82

**Панов А. М.** Качество рабочей силы на рынке труда региона в условиях неустойчивой занятости . . . . . . . . . . . . . . . . 88

**Самосюк Н. А.** Предпосылки перехода на новые методы учета затрат и калькулирования себестоимости в энергетике Республики Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 95

**Толкач А. Г.** Развитие инструментария оценки эффективности административного регулирования предпринимательской деятельности в Республике Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 101

**Трич Ю. А.** Формирование стратегии ресурсосбережения в стекольной промышленности Республики Беларусь . . . . . . 107

**Тымуль Е. И.** Эволюция понятия «риск» и его особенности на предприятиях энергетики . . . . . . . . . . . . . . . . 112

**Цимбаленко С. Н.** Совершенствование финансового механизма предприятий льняного подкомплекса Республики Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 116


### ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Андрияшко М. В.** Пенсионное обеспечение за особые заслуги на территории государств — участников Содружества Независимых Государств . . . . . . . . . . . . . . . . 120

**Бильдейко А. А.** К вопросу о новых критериях оценки эффективности прокурорского надзора в сфере экономики . . . . . . 125

**Василевич Д. Г.** Права и обязанности индивида при смене половой принадлежности . . . . . . . . . . . . . . . . 130

**Вашкевич С. В.** Обеспечение доступа к информации о законотворчестве в Республике Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 136

**Ежова Е. В.** Некоторые особенности апелляционного обжалования решений суда первой инстанции в России и Республике Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 141

**Ефременко Е. М., Березнёв Р. Ю.** Сущность принуждения в гражданском праве . . . . . . . . . . . . . . . . 145

**Заборовский В. В.** Особенности конституционно-правового статуса украинской адвокатуры . . . . . . . . . . . . . . . . 150

**Кострова М. Б.** Некоторые направления совершенствования языковой формы российского уголовного закона с учетом белорусского опыта . . . . . . . . . . . . . . . . 155

**Крутько Р. В.** Наименование религиозных организаций как средство индивидуализации в гражданском обороте . . . . . . . . 160

**Мягкая Е. В.** Ретроспективный анализ правового регулирования подоходного налога в спортивной сфере в современной Беларуси . . . . . . . . . . . . . . . . 165

**Новикова Е. А.** Системность оснований криминализации в уголовном праве . . . . . . . . . . . . . . . . 171

**Пономаренко Ю. А.** Штраф в уголовном праве Республики Беларусь и Украины: общее и особенности, современность и перспективы . . . . . . . . . . . . . . . . 175

**Пузырёв М. С.** Сравнительный анализ исполнения наказания в виде лишения свободы на определенный срок в отношении отдельных категорий осужденных по законодательству Украины и Швейцарии . . . . . . . . . . . . . . . . 179


Репозиторий БарГУ

УДК 947.6

**В. Р. Карнялюк**
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліка Беларусь, 230023 Гродна, вул. Ажэшка, 22, +375 (29) 309 91 21, zrumljowa@mail.ru

# ПАДЗЕІ ВЫМУШАНАЙ МІГРАЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ, ВЫКЛІКАНЫЯ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНОЙ, НА СТАРОНКАХ КНІГ СЕРЫІ «ПАМЯЦЬ»

История вынужденной миграции населения Беларуси в годы Первой мировой войны в определённой степени нашла своё отражение на страницах книг серии «Память». Эвакуация и реэвакуация населения, беженство представлены в книгах как отдельными очерками, так и на примере опубликованных исторических источников. Особенностью серии является тот факт, что материалы по истории беженства и эвакуации представлены преимущественно в изданиях второй половины 90-х годов XX века — начала XXI века. Пятьдесят девять книг серии не содержат упоминания событий, связанных с вынужденной миграцией населения. Наиболее красноречивыми документами истории беженства выступают воспоминания бывших беженцев. Анализ книг серии показывает: материалы по истории вынужденной миграции белорусского населения в 1914—1923 годах представляют собой важный корпус историографии и источников по проблемам исторической демографии Беларуси начала XX века.

**Ключевые слова:** вынужденная миграция; беженство; эвакуация; реэвакуация; книга серии «Память».
Библиогр.: 43 назв.

**V. R. Karnialiuk**
Yanka Kupala State University of Grodno, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 22 Ozheshko Str., 230023 Grodno, the Republic of Belarus, +375 (29) 309 91 21, zrumljowa@mail.ru

# EVENTS OF THE FORCED MIGRATION OF THE POPULATION OF BELARUS CAUSED BY THE FIRST WORLD WAR IN THE BOOKS OF THE SERIES “MEMORY”

The history of the forced migration of the population of Belarus during the First World War is reflected in the books of the series “Memory”. Evacuation, re-evacuation of population and refugee were presented in books as separate essays and as published historical sources. The specific feature of the series is that the materials on the history of refugee and evacuation are presented in the publications of the second half of the 90s of the XX century — the beginning of the XXI century. Fifty-nine books of the series do not mention the events related to forced migration of the population. The most eloquent documents of the refugee history are the memories of former refugees. The analysis of the books of the series shows: the materials on the history of forced migration of the Belarusian population in 1914-1923 represent an important corpus of historiography and sources on the problems of the historical demography of Belarus at the beginning of the twentieth century.

**Key words:** forced migration; refugee; evacuation; re-evacuation; book of the series “Memory”.
Ref.: 43 titles.

**Уводзіны.** Гісторыя міграцыйных працэсаў у Беларусі, выкліканых Першай сусветнай вайной, за апошнюю чвэрць стагоддзя мае даволі істотную гістарыяграфію, у якой адзначыліся як айчынныя, так і замежныя даследчыкі, у прыватнасці, А. Бабкоў, І. Бялова, С. Лапановіч, В. Скалабан, В. Утгаф, М. Цуба [1—6]. Кожнае даследванне ўводзіць у навуковае абарачэнне новы пералік крыніц.

**Метадалогія і метады даследавання.** Вывучэнне бежанскай праблемы вызначыла самыя розныя кірункі, узяло на ўзбраенне розныя методыкі, таму яго даследчыкі бежанства звяртаюцца да ўсё новых дакументаў, якія адлюстроўваюць рознабаковыя аспекты гэтай маштабнай гістарычнай з’явы пачатку XX стагоддзя. Сваё месца сярод гістарычных матэрыялаў займаюць публікацыі ў кнігах унікальнай серыі «Памяць». Гэтыя кнігі пачалі выходзіць з 1985 года і ахапілі ўсе без выключэння раёны Беларусі і яе абласныя цэнтры. Унікальнасць дадзенай серыі ўжо ў яе фармаце і маштабе. Скразная прэзентацыя падзей гісторыі ў кожным кутку Беларусі дазваляе складаць досыць цэласнае ўяўленне пра тую ці іншую падзею, працэс або з’яву даўняй і нядаўняй мінуўшчыны краіны.

© Карнялюк В. Р., 2017

Репозиторий БарГУ

Абапіраючыся на гэтую адметнасць серыі, мы зрабілі спробу ацаніць змест яе тэкстаў, што адлюстроўваюць такія падзеі, выкліканыя Першай сусветнай вайной, як эвакуацыя насельніцтва, бежанства ў 1914—1915 гадах і рээвакуацыя гэтых людзей у перыяд з 1917 па 1923 гады. Адзначым, найперш, што аўтарамі тэкстаў кніг серыі «Памяць» выступалі як акадэмічныя навукоўцы, так і вялікая армія краязнаўцаў, аб чым сведчыць глыбіня аналізу і грунтоўнасць аргументацыі, а таксама высноў розных артыкулаў і нарысаў. Яшчэ адным істотным аспектам, які моцна ўплываў на характар і змест тэкстаў кніг «Памяць», мусім назваць перамены ў тэматычных акцэнтах, якія адбываліся на працягу досыць кароткага, але вельмі ёмістага на падзеі і пераўтварэнні ў грамадстве часу сярэдзіны 1980-х гадоў — пачатку XXI стагоддзя, калі выходзіла серыя. За гэты гістарычны перыяд навідавоку адбываўся пераход ад аднаго пераліку тэм, якія мелі прыярытэт ў савецкіх даследаваннях, да другога, значна больш шырокага спектру навуковай праблематыкі. Ужо ў першай палове 90-х гадоў XX стагоддзя ў кнігах серыі з’яўляюцца мэтанакіраваныя згадкі пра з’яву бежанства. Хаця, у сваёй большасці, і гэтыя згадкі — вельмі павярхоўныя, часта ўзятыя з агульнавядомых гістарычных выданняў, такіх як «Гісторыя БССР» у 5 тамах, «Россия в Первой мировой войне в цифрах» [7; 8]. Гэта тлумачыцца тым, што ўведзеных у навуковае абарачэнне архіўных крыніц пра падзеі бежанства на канец 90-х гадоў XX стагоддзя было яшчэ даволі няшмат, а бежанскі рух не быў ў савецкі час прадметам мэтанакіраванага вывучэння. Па-за ўвагаю савецкіх гісторыкаў заставаліся намаганні розных грамадскіх, палітычных, дзяржаўных і рэлігійных устаноў па дапамозе бежанцам. Таму зразумела, што краязнаўчыя нарысы ў кнігах дадзенай серыі не змяшчалі адпаведных лічбаў і прыкладаў: іх не было адкуль браць. А пошук адпаведнай вуснай гісторыі сярод жыхароў свайго раёна ці горада не ажыццяўляўся і не заахвочваўся. І гэта цалкам адрознівалася ад сітуацыі, напрыклад, у Польшчы, дзе ўжо з 1958 года збіраліся ўспаміны былых бежанцаў. Вынікам такой працы стаў выхад у свет у Беластоку двумя выданнямі ў 2000 і 2015 гадах кніг «Бежанства 1915 года», якія пад вокладкай аб’ядноўваюць 167 ўспамінаў былых бежанцаў тагачаснай Гродзенскай губерні [9; 10]. А тэматыкай савецкіх даследаванняў былі такія бакі ваеннага часу, як рэвалюцыйныя хвалявянні, негатыўная (і нават варожая) рэакцыя насельніцтва на мабілізацыю, згадваліся страты, якія несла сялянства.

Такім чынам, складаная з’ява бежанства заставалася па-за ўвагаю як акадэмічных гісторыкаў, так і краязнаўцаў. Пяцьдзесят дзевяць кніг серыі «Памяць», якія адлюстроўваюць гісторыю пэўных адміністратыўных адзінак краіны, увогуле не маюць згадкі пра падзеі прымусовай міграцыі насельніцтва, звязанай з гэтай вайной (Акцябрскі, Асіповіцкі, Астравецкі, Барысаўскі, Бярозаўскі, Бешанковіцкі, Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Быхаўскі, Віцебскі, Віцебск, Веткаўскі, Воранаўскі, Гарадоцкі, Гомельскі, Гомель, Глыбокае, Дабрынаўскі, Докшыцкі, Дубровенскі, Жабінкаўскі, Ельскі, Капыльскі, Івацэвіцкі, Іўеўскі, Кармянскі, Краснапольскі, Круглянскі, Лагойскі, Лепельскі, Лёзненскі, Лідскі, Любанскі, Магілёўскі, Міёрскі, Мсціслаўскі, Нясвіжскі, Петрыкаўскі, Пружанскі, Пухавіцкі, Рагачоўскі, Расінскі, Рэчыцкі, Свіслацкі, Слаўгарадскі, Слуцкі, Стаўбцоўскі, Талачынскі, Уздзенскі, Чавускі, Чашніцкі, Чэрвенскі, Чэрыкаўскі, Чачэрскі, Хойніцкі, Хоцімскі, Шаркаўшчынскі, Шумілінскі). А там, дзе змешчаны звесткі пра падзеі Першай сусветнай вайны, змест тэкстаў мае адмысловыя танальнасць і ракурсы, дарэчы, даволі ўласцівыя шматлікім даследаванням па гісторыі гэтай вайны на тэрыторыі нашай краіны. Гаворка ідзе пра даследаванні ваенных падзей — баёў, аперацый, ваенных кампаній на тэрыторыі беларускіх губерняў [11—15]. Усе гэтыя тэксты з розных бакоў характарызуюць беларускія землі як велізарны плацдарм для векапомнага ваеннага супрацьстаяння паміж расійскай і германскай арміямі ў 1915, 1916, 1918 гадах.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Каб скласці ўяўленне пра рэпрэзентатыўнасць тых ці іншых аспектаў бежанскага руху ў кнігах серыі «Памяць», зробім спробу сістэматызаваць адпаведныя тэксты кніг серыі па адмысловых характарыстыках гэтага міграцыйнага руху.

Своеасаблівым сілуэтам бежанства могуць быць успаміны жыхаркі Смаргоні Ф. К. Варанішчы (н. у 1907 годзе): «Жылі мы ў Клідзенятах. …Сабраўся сход. Параіўшыся, усе рашылі ехаць. А можа на тое быў і ваенны загад… У хляве заставалася вялікая свіння. Яе завязалі на павадок і старэйшы брат павінен быў гнаць. Але дагналі толькі да бальшака… Так і пакінулі ў канаве... Абапал дарогі многа ляжала загінуўшай жывёлы. Стараліся трымацца разам. Далей да Масквы, а адтуль у Тамбоўскую губерню. У Ліпецк. Там жа былі нашы людзі з Каранёў, Вайнідзенят. Бацька ўладкаваўся …на гарбарны завод, старэйшы брат таксама, а маці на тытунёвую фабрыку. З’явіліся нават зберажэнні. Нанялі кватэру. Прабылі там амаль да 1920 года… Выратаваліся толькі тым, што ўсёй сям’ёй пасля жніва хадзілі ў поле збіраць каласкі… А вясной цвёрда вырашылі вяртацца на радзіму… Тых старых Клідзенят, ужо не было.

Усё было спалена. Перарыта акопамі і бліндажамі… Увогуле людзі, што вярталіся. Першы час жылі ў такіх бліндажах» [16, с. 122]. І хаця жыццё мільёнаў іншых жыхароў Беларусі ўвабрала ў сабе тысячы дадатковых прыкладаў і акалічнасцей бежанскага жыцця, галоўныя вехі яго можна адзначыць: вымушанасць выезду, бедаванне і цяжар сацыяльна-эканамічных праблем, прыстасаванне да ўсяго, прага да вяртання на бацькаўшчыну і панішчаны родны край.

Пачнем з выезду ў бежанства. Матывамі і акалічнасцямі выезду архіўныя крыніцы і занатаваныя ўспаміны саміх бежанцаў згадваюць застрашэнне немцамі, пагрозы, прамыя загады і агітацыю з боку дзяржаўных, ваенных і царкоўных уладаў. Усе гэтыя матывы выезду на ўсход знаходзяць пацвярджэнне ў нарысах серыі [17, с. 51]. «Хадзілі чуткі, што немцы, будуць праходзіць праз нашу тэрыторыю, на сваім шляху знішчаць людзей, спаляць вёскі», — згадвае Д. С. Ляшчына з в. Сіманавічы Драгічынскага раёна [18, с. 114]. Па словах сведкі тых часоў Меленца І. з в. Плюскалаўцы Бераставіцкага раёна, спрыялі выезду ў бежанства і праваслаўныя святары, у адрозненне ад каталіцкіх, яны настойліва заклікалі людзей ратавацца ад нямецкай навалы [19, с. 102]. «Власьці сталы застаўляты, шоб втыкалы ад німця, коб выйішчялы в бежынці», — згадвае Д. В. Клімчук з в. Сіманавічы Драгічынскага раёна [18, с. 111]. Пра прымус і нават пагромы і рабаванні з адначасовым падпальваннем вёсак казакамі і вайскоўцамі рускай арміі, як «аргументах» да выезду ў бежанства, ідзе гаворка ў нарысе пра г. Бабруйск [20, с. 77]. Згадкі аб прымусе да бежанства нярэдкія і, як вядома з крыніц і сучасных даследаванняў, маюць і іншыя пацвярджэнні [21, с. 167]. «Частка насельніцтва ісці далёка ад родных мясцін не адважылася і шукала паратунак ў лясах і балотах», — згадваецца пра вядомую з'яву бежанства ў кнізе «Памяць. Іванаўскі раён» [22, с. 88].

Аднвчасова з выездам ішла праца па арганізацыі самога руху мас людзей. Гэтай справай займаліся розныя арганізацыі і ўстановы, згадкі пра дзеянні якіх можна знайсці на старонках пэўных выданняў серыі. «Эвакуацыя брэстаўчан праходзіла некалькі дзён і неарганізавана. Цягнікі не маглі вывезці ўсіх», — чытаем ў кнізе «Памяць. Брэст» [23, с. 219]. Такая ацэнка падзей знаходзіць пацвярджэнне ў крыніцах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) г. Гродна пра Брэсцкую крэпасць 1915 года. «Царскі ўрад не аказваў ім [бежанцам] ніякай дапамогі», — дае ацэнку арганізацыі дапамогі драгічынскім бежанцам А. А. Башкоў [20, с. 90].

Увогуле, згадкі пра намаганні грамадскіх арганізацый, дзяржаўных і рэлігійных устаноў ў справе дапамогі бежанцам на старонках кніг «Памяць» абсалютна адзінкавыя. Адна з іх, у кнізе «Памяць. Аршанскі раён» — пра Польскі камітэт дапамогі ахвярам вайны [24, с. 163].

Ацэньваючы гэты бок вымушанай міграцыі таго часу, адзначым, што бежанскі рух немагчыма ўявіць без падзей, звязаных з дапамогай уцекачам і эвакуяваным. Але змест тэкстаў практычна не засяроджвае ўвагі на гэтым. Таму ёсць тлумачэнне. Дапамога бежанцам сваім падмуркам мела рэлігійнасць грамадства, з якой натуральным чынам выцякала дабрачыннасць у дачыненні пацярпелых ад вайны. Поўнага спасціжэння з'явы дапамогі бежанцам без асэнсавання месца царквы ў гэтай справе немагчыма, але савецкая гістарыяграфія пакідала гэты бок мінуўшчыны па-за ўвагай даследаванняў.

Сам масштаб бежанства ставіць адной з праблем яго даследавання вывучэнне геаграфіі рассялення вымушаных мігрантаў і жыццё ў бежанстве і эвакуацыі. Да прыкладаў такіх тэкстаў можна аднесці змест кнігі «Памяць. Шклоўскі раён», у якой даецца на падставе звестак з «Магілёўскіх ведамасцяў» дастаткова разгорнутая геаграфія руху бежанцаў па тэрыторыі Шклоўшчыны: згадваюцца маршруты Бялынічы—Галоўчын—Гавяды—Шклоў—Лакуці, Бабруйск—Талочын—Ворша—Холбня, Бялынічы—Шклоў—Горкі—Раманава, Дварэц—Рагачоў—Крычаў—Рослаўль, Калінкавічы—Рэчыца—Гомель—Навазыбкаў (чыгунка) [25, с. 71]. Шляхі і пуцявіны бежанцаў на ўсход паказаны ў тэксце пра Старобіншчыну: «Вялікая канцэнтрацыя бежанцаў на маршруце Баранавічы—Ляхавічы—Сіняўка—Семежава—Селішча—Слуцк вымушала ўлады ўвесь час накіроўваць частку людзей з Семежава на Старобін, а адтуль на Урэчча і Бабруйск. Такім чынам, асноўнымі кірункамі бежанцаў праз Старобіншчыну па грунтовых дарогах з'яўляліся: Семежава—Бучаніца—Вызна—Веска—Плянта—Старобін і Ганцавічы—Ругавічы—Будча—Чудзін—Баравая—Паварчыцы—Старобін» [26, с. 56]. А вось сем'і бежанцаў з Зельвеншчыны ўцякалі ад вайны ў Казань, Іжэўск, некаторых лёс закінуў нават у Сібір [27, с. 61]. І такія прыклады можна лічыць мадэллю ўсяго бежанства. Бо агульная геаграфія рассялення бежанцаў па расійскіх прасторах ахоплівала дзясяткі губерняў [28, с. 42]. Жыхары адной маленькай мясцовасці, такой, як сённяшні Маларыцкі раён, маглі быць раскіданы на сотні і тысячы кіламетраў адны ад другіх, знаходзіцца сярод не проста чужога насельніцтва, але жыць сярод людзей розных нацыянальнасцяў і рознага веравызнання. Хаця былі выпадкі і даволі кампактнага рассялення бежанцаў. Так, «усе лунянецкія бежанцы былі расселены ў некалькі паветах Палтаўшчыны» [29, с. 211].

Рэпазіторый БарДУ

Побач з пытаннем геаграфіі знаходзіцца аспект працяглых стасункаў бежанцаў з карэнным насельніцтвам тых мясцін, куды яны траплялі. Але толькі некаторыя старонкі нарысаў кніг серыі змяшчаюць такія ўражанні бежанцаў ад жыцця ў расійскай правінцыі. Пра прыхільнасць да бежанцаў з боку мясцовага насельніцтва расійскіх паветаў адзначаецца, у прыватнасці, у нарысах Драгічынскага раёна [11, с. 88; 25, с. 90].

Як асобны бок такіх уражанняў ад новага для бежанцаў свету расійскіх губерняў, адзначым згадкі пра адметнасці дабрабыту, ладу жыцця, вядзення гаспадаркі, традыцый, звычак, якім былі сведкам выхадцы з беларускіх губерняў. «А прывыкаць было да чаго, бо побыт мясцовых жыхароў вельмі адроўніваўся ад нашага. Тут не ведалі, што такое беззямелле. Асабліва нас ўражвала, якая вялікая ўвага надавалася ўменню гатаваць...», — дзялілася сваімі ўспамінамі пра знаходжанне ў Самарскай губерні жыхарка Іванаўскага раёна К. Т. Наўроцкая [30, с. 88]. Знаходжанне бежанцаў прасторах расійскай правінцыі было увесь час звязана з працэсам іх сацыялізацыі — вельмі складаным наступствам кожнага міграцыйнага руху. Яго праявы таксама часам знаходзяць адлюстраванне на старонках нарысаў серыі. «Але і наша майстэрства вельмі цанілася. Не было адбою ад заказаў… Паступова абжываліся, многія выходзілі замуж, жаніліся, прычым вельмі часта нашыя дзяўчаты выходзілі замуж за мясцовых хлопцаў», — чытаем ва ўспамінах гэтай жа іванаўскай бежанкі К. Т. Наўроцкай [30, с. 88].

Найбольш прыкладаў пра адметнасці бежанскага руху гавораць аб выпрабаваннях, якія неслі бежанцы ў час свайго руху на ўсход [22, с. 124—125; 25, с. 90; 29, с. 130—131; 31, с. 60]. «Пудводамі дойіхалы до Лунінца. А там вжэ всэ оставылы — скотыну, коня, воза. Погрузылась на пойізд і пойіхалы в глуб Російі», — чытаем у хроніцы Драгічынскага раёна [18, с. 112]. Таксама маем згадкі пра рэквізіцыйныя мерапрыемствы, якія суправаджалі працэс выезду ў бежанства і іншыя выпрабаванні ўцекачоў і эвакуяваных [23, с. 60; 32, с. 103; 33, с. 86]. А яны суправаджалі мігрантаў ужо ў прыфрантавых раёнах Беларусі, дзе наяўнасць бежанцаў была дадатковым фактарам пагаршэння эканамічнага стану насельніцтва [33, с. 91; 34, с. 122—123, 35, с. 60; 36, с. 123]. Тут асобна адзначым даволі змястоўны нарыс Я. Насыткі пра падзеі вайны ў Бялыніцкім краі, у якім засяроджваецца ўвага на маёмасным стане бежанцаў і мясцовага насельніцтва [37, с. 114—115]. Увесь спектр «дробязяў» бежанскага руху, пра якія можна прачытаць на старонках кніг серыі, спалучаюцца з унікальнай калекцыяй аналагічных успамнаў беластоцкіх бежанцаў [9; 10].

Падзеі рээвакуацыі — яшчэ адзін бок нашай бежанскай гісторыі — па-свойму былі не менш драматычнымі, чым яе пачатак. Вяртанне на радзіму было мэтаю большасці бежанцаў. Але тая карціна, якую сустрэла большасць рэпатрыянтаў па вяртанні, уражвала галечаю і катастрафічным разбурэннем. «Як прыйіхалы з Російі, йілы сытняк, бойка; з рызаку котяшкі, то вжэ добрэ, на муку мололы. Рокыв калька ны булы, то позаросталы все поля, лугы, сытняком позаростало», — згадвала Н. А. Клімчук з в. Сіманавічы Драгічынскага раёна [18, с. 113]. Усё сведчыла бежанцам пра абсалютны пачатак у аднаўленні не толькі сваёй гаспадаркі, але і ўсяго жыцця [19, с. 102; 38, с. 119—120]. Такія згадкі маюць нарысы самых розных раёнаў: «Уся ворыўная зямля зарасла драбналессем» (Камянецкі раён) [40, с. 149]. Акрамя таго, бежанцы вярталіся да родных мясцін, якія знаходзіліся пад новай дзяржаўнай уладай — Польшчы, Украіны ці Літвы, што азначала пачатак новых жыццёвых выпрабаванняў [40, с. 100].

Калі казаць аб пэўных статыстычных дадзеных пра эвакуяваных і бежанцаў, то ніводная кніга не змяшчае больш-менш дакладных лічбаў. «Дакладныя звесткі аб колькасці эвакуяваных не захаваліся», — піша П. І. Корнеў пра падзеі эвакуацыі ў Брэсце [41, с. 219]. «Па няпоўных звестках, з Драгічыншчыны, выехала больш за 10 тысяч чалавек. У некаторых сёлах заставаліся толькі лічаныя сем'і», — пазначана ў кнізе «Памяць. Драгічынскі раён» [25, с. 90]. Пра факт масавага бежанства згадваецца ў нарысе Маларыцкага раёна. Прычым геаграфія рассялення бежанцаў толькі гэтага кутка Берасцейшчыны ахоплівае Казанскую, Яраслаўскую, Тамбоўскую, Варонежскую губерні і нават Сібір [42, с. 119]. Казанская, Яраслаўская, Тамбоўская, Томская губерні сталі асноўнай тэрыторыяй рассялення бежанцаў і выгнаннікаў з Мастоўшчыны [38, с. 93]. Памеры бежанства ў момант масавага выезду ўвосень 1915 года красамоўна дэманструюць радкі памешчыка Бабруйскага павету Станкевіча, які згадвае ў лісце да старшыні Савета Міністраў пра 30—40 тысяч бежанцаў, што прыпыніліся на тэрыторыі яго маёнтку [20, с. 61]. Такая выразная абмежаванасць зноў жа тлумачыцца амаль поўнай адсутнасццю даследаванняў гісторыка-дэмаграфічнага зместу па дадзенай тэматыцы.

У якасці адной з высноў нашага аналізу адзначым, што абсалютная большасць тэкстаў серыі пазбаўлена імёнаў мясцовых жыхароў, якія на сабе ад пачатку прымалі гэтую вайну, выконваючы шматлікія работы па ўзвядзенні абарончых збудаванняў, па забеспячэнні арміі, па неаднаразовай мабілізацыі ў дзеючую армію і ў апалчэнцкія дружыны. Асобнаю часткаю цяжару вайны сталі эвакуацыя



Репозиторий БарГУ

і бежанства: працэсы, якія ператварылі насельніцтва ў неабсяжную масу бежанцаў, раскіданую па безмежных прасторах расійскіх губерняў. Міграцыя на ўсход выклікала пазней не меншы зваротны рух, рээвакуацыйны, які расцягнуўся на гады, зноў зрабіўшы актыўнымі ўдзельнікамі вайны наша насельніцтва. Але на старонках кнігі дадзенай серыі такія падзеі адзначаны толькі схематычна.

Толькі некаторыя нарысы змяшчаюць адмысловыя падборкі дакументаў, архіўных матэрыялаў, хаця змест гэтых крыніц не дэманструе таго драматызму і напружання, уздыму накіраванасці на дапамогу пацярпелым, якое было і якое пацвярджаецца масай архіўных крыніц і звесткамі тагачаснай прэсы [29, с. 109]. Найбольшымі яны былі на пачатку, у 1915-м — першай палове 1916 года, калі «пырскі людскога гора» выклікалі эмацыйнае ўражанне ў прадстаўнікоў самых розных колаў насельніцтва [43, с. 3]. Каштоўны змест у падборкі ўспамінаў былых бежанцаў Смаргоншчыны [16, с. 122—123].

**Заключэнне.** Зыходзячы з агляду кніг серыі «Памяць», адзначым, што змест тэкстаў пра падзеі бежанства і эвакуацыі насельніцтва можна разглядаць як своеасаблівае люстэрка стаўлення да падзей Першай сусветнай вайны увогуле. Гэтае стаўленне змянялася, і змяняўся змест адпаведных тэкстаў. Але серыя была завершана да таго часу, калі колькасць апублікаваных матэрыялаў пра бежанства стала адносна заўважнай. Адзначым таксама, што адноснасць гэтая ў тым, што сапраўднай агульнай карціны бежанства з Беларусі пакуль не складзена. Таму суцэльны змест адмысловых тэкстаў кніг серыі «Памяць» можа быць адным са складнікаў для стварэння такога навуковага асэнсавання падзей вымушанай міграцыі беларускага насельніцтва, якімі былі эвакуацыя, бежанства і рээвакуацыя.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Бабков, А.* Беженцы в Беларуси в годы первой мировой войны (1915—1917) / А. Бабков // Гіст. навука і гіст. адукацыя ў Рэсп. Беларусь. — 1993. — Ч. 1 (Гісторыя Беларусі). — С. 131—138.
2. *Белова, И. Б.* Вынужденные мигранты: беженцы и военнопленные Первой мировой войны в России 1914—1925 гг. / И. Б. Белова. — М. : АИРО-XXI, 2014. — 432 с.
3. *Лапановіч, С. Ф.* Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 — кастрычнік 1917 г.) / С. Ф. Лапановіч / М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь, Акад. М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь. — Мінск : Акад. МУС, 2010. — 126 с.
4. *Скалабан, В.* Бежанцы. / В. Скалабан. — Мінск : БелЭн, 1993. — С. 339—340.
5. *Утгоф, В. С.* Белорусские беженцы Первой мировой войны в 1914—1922 гг. : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / В. Утгоф. — СПб., 2003. — 183 л.
6. *Цуба, М. В.* Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенныя бакі) 1914—1918 гг. : манаграфія / М. В. Цуба. — Пінск : ПалесДУ, 2010. — 304 с.
7. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. — Мінск : Навука і тэхніка, 1972—1975.
8. Россия в мировой войне 1914—1918 (в цифрах). — М., 1922. — 108 с.
9. Бежанства 1915 года. — Беласток : Праграм. рада тыднёвіка «Ніва», 2015. — 576 с.
10. Бежанства 1915 года. — Беласток : Праграм. рада тыднёвіка «Ніва», 2000. — 416 с.
11. *Філатава, А. М.* Баранавіцкі край у пажары Першай сусветнай вайны / А. М. Філатава, С. А. Шчарбакоў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка г. Баранавічы і Баранавіцкага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2000. — С. 152—156.
12. *Карнялюк, В. Р.* Спяшаліся на дапамогу / В. Р. Карнялюк // Памяць. Гродзенскі раён. — Мінск : БелЭн, 1993. — С. 64—65.
13. Валожынцы — удзельнікі Першай сусветнай вайны // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Валожынскага раёна / укл. Я. Я. Янушкевіч. — Мінск : Маст. літ, 1996. — С. 107—108.
14. З царкоўна-прыходскага летапісу Нарачанскай Свята-Ільінскай царквы // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Вілейскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2003. — С. 172—174.
15. *Карнялюк, В.* У гады 1-й сусветнай вайны. Спіс жыхароў Ваўкавышчыны, забітых, параненых, прапаўшых без вестак у ходзе баявых дзеянняў / В. Карнялюк // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Ваўкавыскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2004. — С. 144—148.
16. З успамінаў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Смаргонскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1998. — С. 121—123.
17. *Аўдзеева, В.* Кіраўшчына ў XIX — пачатку XX стст. / В. Аўдзеева // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Кіраўскага раёна. — Мінск : Выш. шк., 1997. — С. 40—52.
18. На крутым павароце гісторыі. Лёсы людскія… // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Драгічынскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 1997. — С. 111—115.
19. *Пацэнка, М. І.* Вятры новага веку (1901—1915 гг.) / М. І. Пацэнка // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Бераставіцкага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 1999. — С. 98—102.
20. *Філякоў, У. У.* Парэформены час / У. У. Філякоў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка г. Бабруйска. — Мінск : Выш. шк., 1995. — С. 58—79.


Репозиторий БарГУ

21. *Лукша, В. В.* У гады 1-й сусветнай вайны / В. В. Лукша, А. В. Рогач // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Вілейскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2003. — С. 163—171.
22. Першая сусветная вайна // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2000. — С. 88.
23. *Насытка, Я.* З сівой даўніны / Я. Насытка // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Ляхавіцкага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. — Мінск : БелСЭ, 1998. — С. 47—61.
24. *Лютынскі, В. П.* Орша ў гады першай сусветнай вайны / В. П. Лютынскі // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Аршанскага раёна / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. — Мінск : БелЭн, 1999. — С. 164—166.
25. *Башкоў, А. А.* Драгічыншчына ў складзе Расійскай імперыі / А. А. Башкоў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Драгічынскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 1997. — С. 78—90.
26. *Цуба, М. В.* Першая сусветная вайна / М. В. Цуба // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Салігорскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2004. — С. 55—57.
27. *Броска, Т.* Пасля адмены прыгону / Т. Броска // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Зельвенскага раёна. — Мінск : Паліграфафармленне, 2003. — С. 56—62.
28. *Карнялюк, В.* Гістарычная дэмаграфія І сусветнай вайны: бежанства з заходніх губерняў Расійскай імперыі (1914—1917) / В. Карнялюк // Bialoruskie Zeszyty Historyczny. — Bialystok. — 1999. — № 12. — S. 22—44.
29. *Саўчанка, М. Л.* Піншчына на мяжы стагоддзяў / М. Л. Саўчанка // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2003. — С. 106—109.
30. З успамінаў Кацярыны Трафімаўны Наўроцкай // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2000. — С. 88—89.
31. *Фёдараў, І. А.* Першая сусетная вайна / І. А. Фёдараў, Я. А. Місарэвіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Дзятлаўскага раёна. — Мінск : Універсітэцкае, 1997. — С. 58—61.
32. *Грабянчук, І. В.* Ад рэвалюцыі да рэвалюцыі / І. В. Грабянчук // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Светлагорска і Светлагорскага раёна : у 2 кн. / укл. П. П. Рабянок. — Мінск : Полиграфоформление, 2000. — Кн. 1. — С. 100—104.
33. *Філатава, А.* Рэха рэвалюцыйных падзей / А. Філатава // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Верхнядзвінскага раёна : у 2 кн.— Мінск : Полиграфоформление, 2004. — Кн. 1. — С. 91—92.
34. *Матусевіч, Т. А.* У гады 1-й сусветнай вайны / Т. А. Матусевіч, А. М. Філатава // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Глускага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 1999. — С. 122—123.
35. *Лукін, В. С.* Напярэдадні вялікіх перамен / В. С. Лукін // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Лоеўскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2000. — С. 59—60.
36. *Серадзінскі, У. С.* Мядзельшчына ў агні Першай сусветнай вайны / У. С. Серадзінскі // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Глускага раёна. — Мінск : БелЭн, 1998. — С. 121—126.
37. *Насытко, Я.* Бялыніччына ў другой палове XIX — пачатку XX ст. / Я. Насытко // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Бялыніцкага раёна / рэдкал.: А. В. Агееў [і інш.]. — Мінск : Выш. шк., 1997. — С. 94—115.
38. *Сабасцян, А. С.* Рэвалюцыйны час / А. С. Сабасцян // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Мастоўскага раёна. — Мінск : Полиграфоформление, 2002. — С. 93—96.
39. *Яфімовіч, У.* Пасля «Брэсцкага міру» / У. Яфімовіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Камянецкага раёна. — Мінск : Ураджай, 1997. — С. 149—156.
40. *Шэлехаў, М. У.* Століншчына ў перыяд грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі / М. У. Шэлехаў, Ю. С. Юркевіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Столінскага раёна. — Мінск : БелТА, 2003. — С. 99—101.
41. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Брэста : у 2 кн. — Мінск : БелТА, 1997. — Кн. 1. — 576 с.
42. *Краўцоў, І. Я.* Сполахі над краем / І. Я. Краўцоў / Памяць : гіст.-дакум. хроніка Маларыцкага раёна / рэд.-укл. В. Р. Феранц. — Мінск : Ураджай, 1998. — С. 118—122.
43. Калужский курьер. — 1915. — № 105. — 19 сент.

Паступіў у рэдакцыю 09.03.2017

Репозиторий БарГУ